сы Б.Эпімах-Шыпілы фальклярызаваных «Дзесяці Божых прыказанняў» (8.8.1913), нарысы Р.Кляновіча пра бытаванне нар. песень у вёсцы (13 і 27.11.1913; 5.12.1913). Газета змяшчала этнаграфічныя нарысы пра нар. святы і абрады — калядныя і шчадроўскія (9.1 і 9.2.1914), купальскія (19.6.1914), аўтарскія вершы і казкі ў фалькл. стылі. Надрукавала запісы бел. батлейкі (7, 14, 21, 29.1 і 5.2.1915).

*У. М. Конан.*

**БЕЛАРУ́СКАЙ ТАНЦАВА́ЛЬНАЙ ТВО́РЧАСЦІ ГАЛІНО́ВАЯ НАВУКО́ВА-ДАСЛЕ́ДЧАЯ ЛАБАРАТО́РЫЯ.** Створана 1.1.1981 пры кафедры харэаграфіі *Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.* Навуковы кіраўнік Ю.*Чурко.* Асноўныя мэты лабараторыі: збіранне, навуковая сістэматызацыя і аналіз узораў бел. нар. танцавальнай творчасці, стварэнне фалькл. банка і харэаграфічнага атласа Беларусі, публікацыя навуковых прац, выданне фалькл. зборнікаў, укараненне вынікаў даследаванняў у працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва і практычную дзейнасць кіраўнікоў танцавальных калектываў Рэспублікі Беларусь. У 1981—91 штогод праводзіла фалькл. экспедыцыі з удзелам супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў па гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі. Усяго абследавана 766 вёсак з 104 раёнаў. Фалькл. матэрыял разглядаецца ў разнастайнасці яго сувязей з гістарычнымі, геаграфічнымі і сацыяльнымі ўмовамі бытавання, у адзінстве музычнага, пластычнага, вакальнага і гульнявога пачаткаў. Палявы матэрыял зафіксаваны слоўна-графічным спосабам, на кіна- і фотаплёнцы. У лабараторыі складзены алфавітны, жанравы і тапаграфічны каталогі, фона-, нота-, фота-, слайда- і фільматэка (звыш 17 тыс. адзінак захавання). Створаны фонд літаратуры па харэаграфічным фальклоры, у якім асобным раздзелам пададзены выпіскі з прац фальклярыстаў і этнографаў 19—20 ст. Па матэрыялах лабараторыі напісана больш за 150 артыкулаў для «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (т. 1—5, 1984—87), энцыклапедый «Этнаграфія Беларусі» (1989), «Тэатральная Беларусь» (т. 1—2, 2002—03), апублікавана даведачнае выданне «Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні» (1989), выдадзены шэраг рэпертуарных зборнікаў «Беларускі фальклор на самадзейнай сцэне», навучальных дапаможнікаў і інш. Традыцыйным з'яўляецца правядзенне на кафедры харэаграфіі фалькл. вечароў, на якіх створаныя студэнтамі на аснове сабраных лабараторыяй матэрыялаў танцавальныя нумары аб'ядноўваюцца ў адзіную праграму. Сярод іх: «Чатыры пары года», «Запрашаем на вяселле», «Каляда ідзе», «Гэтыя цудоўныя, цудоўныя гульні», «Гуляем у проса», «З мінуўшчыны ў дзень сённяшні», «Ля крыніцы», «Вялікдзень на Беларусі». Ансамбль «Унукі» пры кафедры харэаграфіі паказаў фалькл. праграму на Міжнародным сімпозіуме па пытаннях харэаграфічнага фальклору пад эгідай ЮНЕСКА у Ноўгарадзе (Расія) 1986. Канцэртныя нумары, створаныя паводле фалькл. матэрыялаў архіва, складаюць аснову рэпертуару «Ансамбля кафедры харэаграфіі БДУК» пад кіраўніцтвам С.Гуткоўскай.

*С. В. Гуткоўская.*

**БЕЛАРУ́СКАЯ АКАДЭ́МІЯ МУ́ЗЫКІ.** Створана ў 1932 як Беларуская дзяржаўная кансерваторыя на базе Мінскага дзяржаўнага музычнага тэхнікума (1924), які меў Бел. студыю оперы і балета і вышэйшы вакальны клас. Першы дырэктар — М.Казакоў (да 1937).

Б.а.м. — вядучая ВНУ універсітэцкага тыпу ў сістэме мастацкай адукацыі Беларусі, нац. навуковы цэнтр бел. музыказнаўства, этнамузыкалогіі і фальклярыстыкі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва, музычнай педагогікі, прымае ўдзел у распрацоўцы дзярж. праграмы «Культура». У структуры навукова-даследчага сектара Б.а.м. праблемная навукова-даследчая лабараторыя музыкі (1990), інфармацыйны цэнтр (2000), савет па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара (кандыдата) мастацтвазнаўства (1996). З 1990 ажыццяўляецца падрыхтоўка і выданне манаграфій, зборнікаў навуковых артыкулаў, метадычных работ і нотных выданняў. З 2001 выдаецца навуковатэарэтычны часопіс «Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі» (гал. рэдактар — В.Яканюк).

У Б.а.м. ад самага пачатку існавання плённа і мэтанакіравана развіваліся традыцыі бел. этнамузыказнаўства, якія былі закладзены навуковай і музычна-фальклярыстычнай дзейнасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ